## Гульнявая праграма па беларускай мове "Ведай роднае слова"

**Мэты:** стварыць умовы для абагульнення ведаў вучняў, набытых пад час урокаў беларускай мовы і літаратуры; удасканалення навыкаў групавой работы; развіцця ў школьнікаў творчых здольнасцей, кемлівасці, артыстызму; выхавання любові да роднай мовы, цікавасці да моўнага багацця беларускага народа.

### Ход мерапрыемства

Чалавеку трэба шмат чаго ведаць. Трэба ведаць сваю мову і іншыя мовы. Трэба ведаць свае казкі і казкі іншых народаў. Трэба ведаць танцы свае і танцы іншых народаў. Безумоўна, найлепш і найперш трэба ведаць ўсё роднае. Нам з вамі трэба ведаць найлепш ўсе беларускае. А як нам вывучыць беларускую мову? Трэба слухаць і гаварыць з тымі, хто ведае яе. Трэба глядзець тэлеперадачы, слухаць радыепередачы, чытаць кнігі на беларускай мове.

Незвычайнай будзе і наша сённяшняя сустрэча, яна адбудзецца ў форме гульнявой праграмы пад назвай "Любі, шануй, ведай роднае слова!". Яе мы прысвячаем дню роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага. Я спадзяюся, што мерапрыемства будзе садзейнічаць абагульненню ведаў, набытых у час урокаў беларускай мовы і літаратуры; дапаможа раскрыць творчы патэнцыял вучняў; будзе садзейнічаць выхаванню цікавасці да моўнага багацця беларускага народа.

Вітаем удзельнікаў гульні, балельшчыкаў і шаноўнае журы!
Сустракайце каманду "Зорка" і яе капітана …. Запрашаецца каманда "Вясёлка" і яе капітан … . Ацэньваць конкурсную праграму будзе кампетэнтнае журы ў складзе...

**1 конкурс "Прывітанне"**
Журы павінна ацаніць эмблемы кожнай каманды і прывітанні.

**2. Адгадайце загадкі ( па 1 б)**
(Капітаны каманд выцягваюць па дзве загадкі)

а) Ні рук, ні ног не мае, а яблыкі страсае. (Вецер)
б) Рук многа. а нага адна. (Дрэва)
в) Вісіць зялены, ляціць жоўты, ляжыць чорны. (Ліст)
г) Ходзіць полем з краю ў край, рэжа чорны каравай. (Трактар)

**3. Гульня "Перакладчыкі"**
Перакладзіце з рускай мовы на беларускую (0,5 б).

а) очки -
б) ковер -
в) кукушка -
г) клюква -

**4. Гульня "Чароўны цыферблат"**

Замест лічбаў на гэтым цыферблаце стаяць літары, а лічбы размешчаны ўнізе. Паспрабуйце разабрацца ў лічбах, і вы прачытаеце імёны і прозвішчы двух народных паэтаў Беларусі. (4 б).

8,1,10,4
10, 2, 7 4 6 4

(Янка Купала)




(Якуб Колас)

8, 10, 2, 5
10, 11, 6, 4, 12




**5.Конкурс капітанаў "Канструяванне слоў"**

Капітаны выклікаюцца да дошкі. Даецца слова, і капітан з яго літар павінен прыдумаць і на адваротным баку дошкі за тры хвіліны напісаць як мага больш слоў, у склад якіх павінны ўваходзіць толькі тыя літары, якія ёсць у зыходным слове. Напрыклад: машына (наш, Маша, шына, мыш і г.д.).

Слова : мовазнаўства.

**6.Конкурс "Словы-змейкі"**

**Вядучы.** Сябры, умовы гэтага конкурсу такія: першы член каманды запісвае на лісце паперы любое слова, якое з'яўляецца назоўнікам. Затым перадае лісток наступнаму члену каманды, які прыдумвае слова, што пачынаецца з апошняй літары папярэдняга (словы не павінны паўтарацца). Даецца на конкурс 3 хвіліны. Пераможа тая каманда, якае складзе даўжэйшую змейку.

**7.Конкурс "Вам слова, юныя паэты!"**

Кожнай камандзе даецца лісток паперы з апошнімі словамі верша. У вершы дзве страфы. Неабходна як мага хутчэй прыдумаць і запісаць верш з прапанаванай рыфмы

............... не спяшаюся,
.................стараюся.
................. у здабытку,

_____ у сшытку.
_____ Якуб Колас.
_____ голас.
_____ чытач,
_____ чытаць.

Пасля конкурсу каманды (капітаны) агучваюць свае варыянты і аддаюць журы для азнаямлення і вызначэння пераможцы.

**8.Конкурс "Папацей, грамацей!"**
**Вядучы.** Не сумняваюся ў тым, што члены каманды "Зорка" і каманды "Вясёлка" - вельмі граматныя вучні, і ім нічога не каштуе атрымаць "10" за дыктоўку. Аднак наша дыктоўка незвычайная. Яна - камандная. Кожны член каманды піша толькі 1 сказ і перадае лісток наступнаму свайму таварышу. Пачынае пісаць тэкст капітан, і ў канцы ў яго будзе 30 секунд, каб праверыць напісанае і здать дыктоўку журы. Пачынаем.

*Зубр*

*Самы вялікі звер Белавежскай пушчы - зубр. Гэта магутная жывёла. Грудзі ў яго шырокія, шыя шырокая і тоўстая. Поўсць густая, бурая. Зубр у жыцці вельмі спакоты. Няма ў яго ворагаў, ды і чалавек аберагае яго.*

**9.Конкурс "Аматары беларускага фальклору"**
**Вядучы.** У мяне ёсць 2 канверты, аднак лістоў у іх няма. У канвертах знаходзяцца вядомыя беларускія прыказкі. Праўда, нейкі маленькі шкоднік пажартаваў і разрэзаў прыказкі напалам, а пасля яшчэ і ўсё пераблытаў. Але я думаю, для нас гэта не праблема.
Заданне: за 3 хвіліны ўзнавіць як мага больш беларускіх прыказак. А іх тут схаванароўна 10.
I.Са свайго языка спусціш -/ на чужым не зловіш.
2.Слухай многа, /а гавары мала.
3.У добрую часіну сказаць,/ а ў ліхую прамаўчаць.
4.Адною рукою/ і вузла не завяжаш.
3.Дзе розумам не дайду, /дык у кніжцы знайду.
б.Новых сяброў нажывай, /але старых не забывай.
У.Ладзь калёсы зімой, /а сані летам.
3.Лепей мець вераб'я ў руцэ,/ чым арла на суку.
9.Не раскусіўшы арэх, /зерня не з'ясі.
10.Госць на парог - /гаспадыня за пірог.

**10.Конкурс " Пазнай фразеалагізм!"**
**Вядучы.** Кожны ўдзельнік каманды выходзіць да стала, за якім знаходзіцца журы, і выцягвае са стоса картку з фразеалагізмам. Яго задача - з дапамогай мімікі, жэстаў і тых рэчаў, якія ляжаць на стале, растлумачыць фразеалагізм. Задача членаў каманды - пазнаць гэты фразеалагізм.
Фразеалагізмы: з кута ў кут, абвесці вакол пальца, закасаўшы рукавы, матаць на вус, па галоўцы гладзіць, брацца за жывот, кляваць носам, хоць касой касі, зарубіць на носе, язык часаць, рукамі разводзіць, сядзець склаўшы рукі, язык

высалапіўшы, абіваць парогі, віляць хвастом, задзіраць нос, за язык пацягнуць, зуб на зуб не пападае, круціць носам.

Гульня з гледачамі: **ЗАДАННІ ДЛЯ ЎСМЕШКІ**
Назаві мелодыю, якую любяць вучні ў канцыўрока. (Званок)
Чым канчаецца даль? (Літарай ь)
Якая музычная нота патрэбна для супу? (Соль)
Без чаго хлеба не бывае? (Без скарынкі)
Пад якім кустом заяц спіць ў дождж? (Пад мокрым)
Што кусаецца, але не брэша? (Крапіва)
Як назваць сухую траву чатырма літарамі? (Сена)
Назаві словы, у якіх сто зычных (Стол, стог, стогн, стос)
Што ўсіх нас робіць людзьмі? (Мова)

Падвядзенне вынікаў апошняга конкурсу і гульні. Узнагароджванне пераможцаў.

Жадаю вам, дзеці, і далей лагодна
Мовай народа валодаць свабодна.
І ў жыцці каб было вам лягчэй,
Мову сваю вывучайце хутчэй.
А сёння, мае хлапчукі і дзяўчынкі,
Узнагароджу я вас за ўдзел у віктарыне
-Прызы атрымайце за веданне мовы.
Любіце, шануйце роднае слова!